ГОМЕЛЬСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АЛЕКСЕЙ АЛЕКСЕЕВІЧ ВОЛКАЎ

Гэта біяграфія пачынаецца ў сале Дмітрыеве, былой Разанскай губерні, у пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя. Яна агульна тысячам і сотням тысяч чалавечых біяграфій нашай краіны.

Крытыя саломай хаткі, дзіч і глуш старой разанскай вёскі, галеча, забітасць, цемра. У гаспадарцы — ні зямлі, ні каня, ні каровы. Бацька — у грашовых заработках у горадзе Уладзіміры. Матка — па кухарнаму промыслу.

І нас не здзіўляе самае сапраўднае засмучэнне бацькі, калі сямігадовы Алёша выказаў недвусэнсоўнае жаданне пайсці «па вучонай частцы», паступіць у пачатковую земскую школу.

— Ужо лепш-бы ты лапаць сплёў, чым ў школу пайшоў... Падумаеш, грамацей знайшоўся... Навошта-ж трэба? Трэба... А каб цяпер — заробіць трэба? Трэба... Вучоны!

З «навукай» яўна непашчавала. Правучыўся два гады і на гэтым закончыў, уступіў ужо ў сапраўдную школу, суровую школу жыцця. З дзевяці год пайшоў з розага сяла, каб больш у яго не вяртацца. Пачалося «самастойнае» жыццё. У першыя гады пасвіў пялят, коней. Потым працаваў «хлопчыкам на пабягушках» у чайных, у кафбасных, у трактірах, у рымарных майстэрнях.

Вы ведаеце, што такое «хлопчык на пабягушках»? Гэта універсальная істота. Яна павінна ведаць прафесію свайго гаспадара, «нораў» яго самога, яго сутуругі, капрызы яго гамачнаў, вялікіх і малых волрыскаў гаспадарчага дома. Яна павінна працаваць ад цямна да цямна, быць абавязкова бітай, хаваць у сінняках ад затрошчын, пазатыпі вікаў і зубатычын. Ды і ноччу нагрузка — пакалыхаць калыску, пагрэць самавар гаспадарскіх гостцяў, збегаць за бутэлькай для гаспадарскіх майстраў, падмайстраў.

Усе гэтыя маленькія гаспадарчыкі — уласніхі ўсялякіх майстраваў, чайных, трактіраў — гэта разнавіднасць самых прагавітых пачуткоў-эксплаататараў, вялікіх спецыялістаў па выгаднасці дзесятага поту з сваіх падначальных.

— Імкнна тады ўжо, — гаворыць Алексей Алексеевіч, — у мяне зараджаліся першыя думкі аб неабходнасці самай суровай барацьбы з эксплаататарамі чалавека. Нашу мову ненавідзелі мы сваіх гаспадароў, і было за што. Змагаліся, як маглі, змагаліся за сваю жабракую заработную плату, за больш сярпімае існаванне. Даведаюцца гаспадары, што ты важак, не бяруць на работу... Ды і іншым браць не гаварэндуюць...

Такое было дзяцінства і юнацтва нашага кандыдата.

* * *

Дваццацічатырохгадовым хлопцам жыццё прывяло ў Пецярбург.

Суровыя грамады Пуцілаўскага завода. Больш чым векавая гісторыя гіганта-завода, аснаванага яшчэ ў 1789 годзе. Велізарнейшы калектыў рабочых. Людзей тут было больш, чым у іншым сярэднім губернскім горадзе. Гісторыя завода — гісторыя рабочага руху ў Расіі. Расказы аб мінулым — аб рабочых, выступаўшых калісьці супроць зверскіх умоў эксплаататыі. Яшчэ ў 1809 годзе ваенны суд прыгізарыў двух рабочых за сумесную палачу спаргаў — аднаго да 105 удараў бізуна і ссылкі на катаргу, а другога — за пакаранне шпіцрутэнамі (жалезнымі прутамі), да шасці тысяч удараў. Катаргі яму ўжо не давалі, яшчэ далёка за тысячы пазаўсёды абрывалася чалавечае жыццё...

Расказы аб перамогах рабочых у забастоўках 1876 і 1885 гадоў. У васьмідзесятых гадах тут пачалася ўжо сацыял-дэмакратычная прапаганда. У дзевяностых гадах сярод пуцілаўцаў вялуць работу члены сацыял-дэмакратычнай групы «старыкоў», на чале якой стаяў В. І. Ленін, які стварыў з асноўнага ядра гэтай групы «Пецярбургскі саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа».

Пуцілаўцы — застрэльшчыкі масавага рэвалюцыйнага руху, прывёўшага да выступлення 9 студзеня 1905 года. Рэвалюцыйныя выступленні восеньню 1911 года, у 1912 годзе, 1913 і ў наступныя годы.

На повалу падзей па Пуцілаўскім заводзе ў 1916 годзе (хваляванні рабочых у лютым і сакавіку, арышт 150 рабочых, часовае закрыццё завода) Пецярбургскі камітэт большэвікоў пісаў у адной з пракламацый:

«Урал лічыць Пуцілаўскі завод найбольш небяспечным для сябе, ведаючы, што ён зусёды з'яўляецца застрэльшчыкам рэвалюцыйных выступленняў пецярбургскага пралетарыята. І ён не памыляецца: калі было заўсёды, так будзе і цяпер...»

У 1917 годзе Пуцілаўскі завод быў верным аплотам партыі большэвікоў. У дні пуцілаўцы сталі ў сябе Уладзіміра Ільіча. У часе Кастрычніцкай рэвалюцыі пуцілаўскія рабочыя ішлі ў перадавых радах Чырвонай гвардыі. Усё, што патрэбна было для барацьбы з шматлікімі ворагамі — гарматы, броневікі, спаражнае — давалі гарадзкія рабочы калектыў «слаўнага «Красного путиловца».

І ў гэтым баявым калектыве быў валады рабочы сутаргабудаўнічага цэха — Алексей Алексеевіч Волкаў. Старыя пуцілаўцы-большэвікі — Баранаў, Іван Агароднікаў — далучалі маладога рабочага да свядомага грамадзянскага жыцця, вялі, яго са масавыя маёўкі, прывівалі яму першыя навыкі баявога палітычнага жыцця, вучылі змагацца з самадзяржаўем.

У 1915 годзе партыйная арганізацыя сутнабудаўнічага цэха прымае Алексея Волкава ў рады партыі большэвікоў. Партыя клапаціцца выгадавае чалавека. Гэта ўжо не хлопчык на пабягушках.

Перад намі выступае перадавы рабочы, зіцільны дапь дастойны адпор эксплаататарам, узначаліць свой родны калектыў.

Хваляванні на заводзе ў пачатку 1917 года. Акцыянер Обухаў, надрываючы горла, крычыць рабочым:

— Усіх, хто сёння-ж не выступіць да работы, выкінем на вуліцу!

Мітусяцца штрэйкбрэхеры, напкоўваюць Обухава на маладога рабочага Волкава, ліслівя шэпчуць на вуха заводчыку:

— Галоўны бунтар-жа ён, узяць-бы яго...

Павольнай крадучайся пахопкай набліжаецца Обухаў да маладога рабочага, які ў парванай і прамаленай блузе стаіць наперадзе рабочай масы. Вось-вось, здаецца, учапіцца пучкія пальцы заводчыка ў горла рабочага...

— А ну, чаго глядзіш! — крычыць хтосьці ў натоўпе. Моцныя рукі рабочых пахватваюць заводчыка, упіхваюць яго ў першую трапіўшую тачку, урачыста, з поўным, што называецца, пэрэманіядам, вывозяць за вароты завода.

З таго часу майстры пабойваліся маладога рабочага. Ненавідзелі і баяліся...

У 1915 і ў 1916 гг. тав. Волкаў працуе ў Гельсінгфорсе на плывучай майстэрні «Ніцша» па рамонту ваенных караблёў. У гэты час ён праводзіць ужо вялікую палітычную работу не толькі серод рабочых, але і сярод матросаў Балтыйскага флота.

* * *

Прыйшла лютаўская рэвалюцыя. У [illegible] нічо[illegible] пачу[illegible] выбраны першы рабочы камітэт. У [illegible] выбіраюць Алексея Алексеевіча. [illegible] неўзабаве рабочы камітэт [illegible] за [illegible] [illegible] работ, [illegible] на зніжэнне штрафы.

1918 год. Абраны транспарт. Ідуць [illegible] у [illegible] [illegible] і фабрык — [illegible].

Панура перакатваюцца свінцовыя хвалі Фінскага заліва. Па поясе у [illegible] працуюць ля берага пуцілаўцы, з дапамогай «Дубінушкі» цягнуць старыя оставы марскіх барж, рубяць, разбіраюць, грузяць на бераг. Гэта апал для [illegible] энергія для яго машын і станкоў, патрэбных рэвалюцыі. Разбаркай барж кіруе Алексей Алексеевіч.

Так праходзілі дзіўныя па сваёй велічы ленінскія субботнікі, дзе чалавечая энергія, узяты чалавечай волі апраўдвалі самыя цяжэйшыя здавалася-б, перашкоды. Удзельнікі гэтых субботнікаў хаваюць такімі ў сваёй памяці і чуллівыя ўспаміны аб таварышах пайках.

— Па сканчэнні работы — кожнаму ўдарны паёк: асьмушку хлеба, пачку махоркі, адну цукерку і дзвін селядзец.

— Не за грошы працавалі мы тады, — гаворыць Алексей Алексеевіч, — а працавалі за рабочую совесць, за будучае наша, якое потым і атрымалі...

З вялікім хваляваннем успамінае Алексей Алексеевіч і другі субботнік.

— З пілами, тапарамі, лапатамі ішлі праз увесь горад калоны людзей, ішлі на Марсава поле, дзе знаходзяцца магілы барацьбітоў за пролетарскую рэвалюцыю. Ішла тая стая сотня чырвонагвардзейцаў Пуцілаўскага завода. Кіпіць работа на Марсавым полі, агарожа парэшкаў палацаў пераносіцца на брацкія магілкі. Глыбы мрамара, пагля лёгка пераносяцца людзьмі, не адчуваючымі стомленасці. Саджаюць тысячы дрэваў.

Так ствараюцца і любоўна ўпрыгожваюцца брацкія магілкі тых,

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ